Беларусь на 2016-2020 гг.

Работа по созданию трехмерных моделей памятников архитектуры Беларуси проводится и силами преподавателей и студентов кафедры информационных технологий в культуре БГУ культуры и искусств. Выполнена виртуальная реконструкция полностью утраченного францисканского костела Святой Троицы г.Сенно Витебской области, являющегося уникальным памятником позднего (виленского) барокко, работы по физической реконструкции которого на данный момент не ведутся. Разработаны трехмерные модели монастыря картезианцев в Березе, Лошицкого усадебно-паркового комплекса, Гольшанского замка, единственного сохранившегося на территории Беларуси здания общественного жилья стиля барокко – "Домика на рынке" (1721 г.) в Несвиже, крестьянского дома из деревни Исерно Слуцкого района, который является частью экспозиции Белорусского государственного музея народной архитектуры и быта.

Создание и демонстрация исторических трехмерных реконструкций дает возможность перейти на качественно новый уровень сохранения и передачи историко-культурного наследия. Передовые компьютерные технологии широко востребованы в информационном пространстве XXI века, помогают воспитанию патриотизма и развитию в обществе потребности в сохранении своего национального достояния.

---


1. Беницевич, Н. Какие замки Беларуси получили право на новую жизнь / Н. Беницевич // Белорусский портал TUT.BY [Электронный ресурс]. – 2012. – Режим доступа: http://www.news.tut.by/society/281794.html – Дата доступа: 22.03.2015.

2. Бородкин, Л. И. Виртуальная реконструкция московского Страстного монастыря (середина XVII – начало XX вв.): анализ эволюции пространственной инфраструктуры на основе методов 3D моделирования [Электронный ресурс]. – 2014. – Режим доступа: http://www.istina.msu.ru/ projects/6532104/ – Дата доступа: 12.09.2015.

3. Популярная художественная энциклопедия / под ред. В.М. Полевого. – Москва: Советская энциклопедия, 1986. – Т.2. – 464 с.

4. Постановление Совета Министров Республики Беларусь от 26.12.2010 № 1905 «Аб зацвярджэнні Дзяржаўнай праграмы «Культура Беларусі» на 2011–2015 гады» // Национальный правовой интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс]. – 2014. – Режим доступа: http://www.pravo.newsby.org/belarus/postanovsm2/sovm636.htm. – Дата доступа: 21.03.2015.

5. ГНТП «Информационные технологии», 2011-2015 годы // НАН Беларуси [Электронный ресурс]. – 2011. – Режим доступа: http://www.asio.basnet.by /programs /details.php?ELEMENT_ID=160 – Дата доступа: 12.09.2015.


## АСЭНСАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ЭТНАСУ БЕЛАРУСАЎ ПРАЗ ТРАДЫЦЫЙНУЮ КУЛЬТУРУ


**Лысак К. Ф.**

*аспірант кафедры культуралогіі*

*УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”*

*(Рэспубліка Беларусь, г. Минск)*


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сучасным свеце буйных глабалізацыйных працэсаў у палітычнай, эканамічнай, культурнай і іншых галінах, уніфікацыі норм, ідэалаў і духоўных каштоўнасцяў, усё больш пашыраецца меркаванне аб зніжэнні ролі нацыянальных дзяржаваў, а разам з гэтым і нацыянальных культур. Але нацыя працягвае існаванне як калектыўны суб’ект культуры. Чалавек, нават не зважаючы на гэту акалічнасць, успрымае навакольную рэчаіснасць праз прызму нацыянальных асаблівасцяў. Прычым стасункі ў сістэме нацыянальных культурных каардынат выбудоўвацца не толькі паміж членамі адной супольнасці, але і з прадстаўнікамі іншых культур.

Аднак, адкрытая інфармацыйная прастора, стандартызаваная культура аказваюць грунтоўны ўплыў на свядомасць сучаснага чалавека і яго адносіны да сваёй нацыянальнай прыналежнасці. Зніжэнне ролі нацыянальнай ідэнтычнасці адкрывае шлях іншым уплывам, што не спрыяе прыняццю адказнасці за сваё жыццё, зніжае асэнсаванне неабходнасці дзяржаўнасці, пазбаўляе адчування прыналежнасці да вялікай і магутнай супольнасці, што спараджае пачуццё адзіноцтва і страты сістэмы каштоўнасных арыенціраў.

Існуюць тры стадыі перахода традыцыйнай этнічнай супольнасці да нацыі, якія вылучаны чэшскім даследчыкам М. Хрохам. Гэтыя этапы асабліва слушна пасуюць да нацыянальных рухаў на тэрыторыі былой Рэчы Паспалітай.

Стадыя А: Развіццё нацыянальнай культуры, заснаванае на мясцовай мове і яе выкарыстанне ў адукацыі, кіраванні і эканамічным жыцці. На першай фазе цікавасць да нацыі мае пераважна асветніцкі, фальклорны характар. Нацыянальныя актывісты вывучаюць родную мову і культуру. Усведамляюцца свае карані і фарміруецца адзін са слупоў кожнай нацыі – гістарычная памяць;

Стадыя В: Здабыццё грамадзянскіх правоў і палітычнага самакіравання – спачатку ў форме аўтаноміі, а ў канчатковым выніку і незалежнасці. У барацьбу ўступае новае пакаленне нацыянальных актывістаў, якія пачынаюць весці мэтанакіраваную прапаганду сярод насельніцтва, якое павінна стаць нацыяй.

Стадыя С: Стварэнне завершанай сацыяльнай структуры, якая ўключае ўсю этнічную групу і адукаваныя эліты, класы чыноўнікаў і прадпрымальнікаў, сялян і працоўных. Нацыянальны рух становіцца масавым, гэта значыць не толькі інтэлектуалы ўяўляюць нацыю, але само насельніцтва становіцца нацыяй. Пасля гэтага ключавой мэтай нацыянальнага руху становіцца афармленне палітычнага цела нацыі – дзяржавы [4, с.44].

Як бачна, на стадыі А, якое мае істотнае значэнне для наступных этапаў, асаблівае месца займае вывучэнне народнай культуры. Вядома, што ў параўнанні з іншымі куткамі Расійскай імперыі, ў свой час на беларускіх землях было назапашана найбольшая колькасць фальклорнага матэрыялу. Сярод вядомых даследчыкаў беларускай традыцыйнай культуры можна адзначыць такіх дзеячоў як І.І. Насовіч, Я. Баршчэўскі, графы К. і Я. Тышкевічы, Я.Ф. Карскі, А.Я. Багдановіч і іншых. Варта таксама адзначыць дзейнасць таварыства філаматаў і філарэтаў Віленскага ўніверсытэта. Цікавым з’яўляецца той факт, што гісторык і этнограф Мітрафан Доўнар-Запольскі, які напачатку сваёй дзейнасці быў схільны да заходнерусізму, у працэсе вывучэння беларускай мовы, традыцыйнай культуры і гісторыі, упершыню сфармуляваў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пастулаты незалежніцкага беларускага гістарычнага наратыву. Гэта аказала істотны ўплыў на развіццё беларускага нацыянальнага руху. Такім чынам, усебаковае вывучэнне нематэрыяльнай культурнай спадчыны калектыўнага суб’екта вядзе да глыбокага разумення яго сутнасці і адметнасці, што выяўляецца ў асэнсавнні спрадвечных народных норм, каштоўнасцяў і ідэалаў. Гэта, у сваю чаргу спрыяе больш глыбокаму разуменню сваёй унікальнасці і належнага месца ў свеце, а таксама дазваляе больш дасканала ўспрымаць культуры іншых народаў. Вывучэнне традыцыйнага фальклору можа шмат распавесці пра вобразы культурных герояў, уяўленні аб уладкаванні свету і прасторава-часавага быцця, сутнасць і прызначэння чалавека, цэнтральныя архетыпы – пра ўсё тое, што з’яўляецца неад’емнай часткай калектыўнай свядомасці.

Ідэалы і каштоўнасці, які ўласцівыя калектыўнаму суб’екту, маюць устойлівы характар яшчэ на стадыі этнічнай супольнасці. Даследаванне так званага «этасу», як сістэмы дадзеных культурных характарыстык, пачынаецца пры вывучэнні этнічных груп. Напрыклад, амерыканскі культурантраполаг А. Крёбер вызначаў этас як сістэму ідэалаў, каштоўнасцяў, дамінуючых у культуры, якія маюць тэндэнцыю кантраляваць паводзіны яе членаў [1]. На жаль, паняцце этасу амаль не вывучаецца ў айчыных гуманітарных даследаваннях, але досыць грунтоўна раскрыта ў працах такіх расійскіх даследчыкаў як В.В. Салтыкова, Ю.І. Сідарэнка, В.Ф. Смазнова.

В.В. Салтыкова вызначае нацыянальны этас як катэгорыю культуры, у якую ўключана базавае ядро нацыянальных каштоўнасцяў, ідэалаў, нормаў, сэнсажыццёвых арыентацый, культурных патэрнаў, якія з'яўляюцца дамінантнымі ў кожнай пэўнай культуры і якія выконваюць функцыю кантролю за паводзінамі носьбітаў дадзенай культуры. Засвойваючы каштоўнасці навакольнага свету, індывід абапіраецца на ўстояныя ў яго культуры традыцыі, звычаі, нормы, прынцыпы і стэрэатыпы паводзін, якія аказваюць істотны ўплыў на фарміраванне індывідуальнай сістэмы каштоўнасцяў і сэнсажыццёвых арыентацый, якія служаць галоўным кіраўніцтвам у яго жыцці і дзейнасці [3].

Нормы, каштоўнасці, ідэалы, маральна-этычныя ўстаноўкі беларускага народу выразна праяўляюцца ў традыцыйным фальклоры. Пад час паўстання беларускай нацыянальнай ідэі яны працягвалі трансляваццa праз разнастайныя віды мастацкай творчасці.

Істотнае месца ў міфалагічнай свядомасці беларусаў займае зямля. Яна ўсведамляецца як адна з асноўных касмічных стыхій, крыніца жыцця і ўсяго жывого, у тым ліку і чалавека. Такім чынам, у калектыўнай свядомасці беларусаў зямля гуляе ролю значнага архетыпу, які выяўляе сябе ў такой каштоўнасці як любоў да Радзімы. Зямля, як крыніца жыццядайных сілаў, патрабуе не толькі абароны але і дбайнай працы, любові і паважлівага стаўлення, і толькі тады яна аддзячыць чалавеку сваім плёнам – не менш значнай каштоўнасцю акрамя любові да Радзімы для беларусаў з’яўляецца гаспадарлівасць. У шматлікіх творах вусна-паэтычнай спадчыны працавітасць і руплівасць падкрэсліваецца як station станоўчая якасць. Лянота і карыслівасць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пераважна прыпісваецца сацыяльным антыподам селяніна – панам, які звычайна асацыююца з нячыстай сілай. Героі шматлікіх казак і паданняў змагаюцца з сацыяльным і духоўным прыгнётам, што сведчыць пра такую істотную каштоўнасць як воля, гэта значыць свабодна жыць на сваёй зямлі, кіраваць сваім лёсам і прымаць уласныя рашэнні. У беларускім фальклоры можна прасачыць прысутнасць прадстаўнікоў розных этнічных груп – цыганоў, габрэяў, украінцаў, палякаў і іншых. Нягледзячы на тое, што ў традыцыйнай культуры не заўсёды станоўча ўспрымаюцца «чужынцы» – ў беларускім фальклоры ўсе падобныя персанажы маюць і станоўчы бок: яўрэі заўсёды былі персанажамі беларускага вяселля, калядавання і батлейкі, цыганы набылі прызнанне як кавалі, музыкі, спевакі, танцоры і муштроўшыкі жывёл. Шматэтнічны і шматрэлігійны склад насельніцтва беларускіх земляў заклаў аснову такой каштоўнасці як талерантнасць.

Такім чынам, традыцыйная культура і нематэрыяльная спадчына выконваюць істотную ролю пры пабудове нацыянальнага праекту. Праз вывучэнне аўтэнтычнага фальклору адбываецца працэс асэнсавання норм, каштоўнасцяў, ідэалаў і маральна-этычных установак народу, які ў якасці сістэмы ўяўляюць сабой так званы “нацыянальны этас”. Даследаванне этасу вядзе да больш грунтоўнага ўсведамлення духоўных арыенціраў нашага грамадства, яго каштоўнасцяў, ўзмацненню нацыянальнай ідэнтычнасці і разумення сваёй гістарычнай ролі.

1. Антропология А. Крёбера // УДІК [Электронный ресурс]. – 2015. – Режим доступа: http://udik.com.ua/books/book-510/chapter-17693/. – Дата доступа: 10.04.2015.

2. Міфалогія беларусаў : энцыклапедычны слоўнік / І. Клімковіч [і інш.]; пад агул. ред. Т. Валодзіна. – Минск: Беларусь, 2011. – 605 с.

3. Салтыкова, О.В. Национальный этос и ценности трудовой деятельности / О.В. Салтыкова // электронная библиотека диссертаций [Электронный ресурс].– 2015. – Режим доступа: http://www.dissercat.com/content/natsionalnyi-etos-i-tsennosti-trudovoi-deyatelnosti. – Дата доступа: 10.04.2015.

4. Хрох, М. От национальных движений к полностью сформировавшейся нации: процесс строительства наций в европе / М. Хрох. – М.: Пракис, 2001. – 436 с.

## ПЫТАННІ РЭАЛІЗАЦЫІ ПЕДАГАГІЧНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ ФАЛЬКЛОРУ Ў ДЗЕЙНАСЦІ МАСТАЦКІХ АМАТАРСКІХ КАЛЕКТЫВАЎ ФАЛЬКЛОРНАГА КІРУНКУ

**Ражкова Л. Л.**

*кандыдат мастацтвазнаўства, заг. кафедры беларускай народна-песеннай творчасці*
*УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*
*(Рэспубліка Беларусь, г. Мінск)*

Сучасны мастацкі калектыў фальклорнага кірунку – гэта адна з цікаўных і складаных форм мастацкага аматарства. Ён узнаўляе традыцыйную народную спадчыну (песні, танцы, інструментальныя найгрышы) пераважна ў сцэнічных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ